Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І.Слабодчыкава ”

Карэкцыйны занятак “Развіццё пазнавальнай дзейнасці”
7 клас (8 клас па праграме першага аддзялення дапаможнай школы,
дапаможнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю)

# Тэма: Структура сказаў

Настаўнік-дэфектолаг
Н.А. Цімашчук

Задачы: фарміраваць уменне складаць развітыя сказы з апорай на пытанні; пашыраць і канкрэтызаваць уяўленні аб восені, аб асенніх прыкметах, працаваць над засваеннем назваў асенніх месяцаў;

Развіваць зрокавае ўяўленне, адвольную ўвагу, звязнае маўленне шляхам удасканальвання граматычнага ладу мовы.

Выхоўваць эстэтычнае пачуццё.

Абсталяванне: запіс гукаў восені; карткі для гульні "Даскажы слова", камп'ютарная гульня "Блытаніна", карткі з часткамі прыказак, музычнае суправаджэнне фізкультхвілінкі

Ход

I. Арганізацыйны момант

Надыйшла восень. Усё радзей свеціць сонейка, але, калі яно выглядае, то адорвае нас пяшчотнай усмешкай і пасылае нам апошнія часцінкі свайго цяпла і святла. Давай і мы з табою пашлём адзін аднаму часцінкі свайго цяпла. (Узяцца за рукі).

II. Актуалізацыя ведаў і пастаноўка праблемы.

Давай зараз паслухаем гукі і падумаем да якой пары года яны адносяцца? (шум дажджу і развітальнае сумнае курлыканне жураўлёў)

Як ты думаеш, аб чым мы будзем гаварыць на занятку? (Аб восені)

III. Асноўная частка

1. Пастаноўка задач карэкцыйнага занятку

Такім чынам, сёння мы будзем гаварыць аб восені, а дакладней будзем складаць сказы аб восені, аб яе прыкметах з апорай на пытанні.

2. Самастойная работа. Картка № 1.
   Гульня "Даскажы слоўца". Падбор да назоўнікаў дзеясловаў, якія падыходзяць па сэнсе.
   Сонца –
   Дождж –
   Вецер –
   Птушкі –
   Дні –
   Грыбы –
   Лісце –

Зямля –
Ураджай –
(Калі адчуваюцца цяжкасці, можна прапанаваць картку са словамі дапаможнікамі)

3. **Рубрыка “Цікава ведаць”**
Паведамленне настаўніка аб трох перыядах восені, іх характэрных асаблівасцях, аб паходжанні назваў асенніх месяцаў.
Любая пара года прыходзіць не адразу, а паступова. У восені выдзяляюць тры перыяды: ранняя восень, залатая восень і позняя восень.
Першы асенні месяц – верасень. Назва верасень паходзіць ад слова "верас" (менавіта ў гэты час расліна верас пачынае сваё цвіценне). Неспрыяльныя ўмовы надвор'я верасня - выпадкі частых дажджоў, ранніх замаразкаў, вялікіх вятроў. Сяляне стараюцца ўбраць бульбу, гародніну і садавіну. Дрэвы мяняюць сваю афарбоўку, каб пазней засвоіць сонечную энергію: чырвонае, карычневае, пунсовае і жоўтае лісце робіць гэта лепш, чым зялёнае. Пасля першых замаразкаў пачынаецца лістапад.

Кастрычнік Беларуская назва месяца паходзіць ад слова "кастрыца": у гэты час сяляне трапалі, часалі лён і каноплі, з якіх ападала шмат кастрыцы (паказаць малюнак). А таксама таму, што палілі кастры падчас добраўпарадкавання тэрыторыі.
Кастрычнік - сярэдні месяц восені, характарызуецца зменлівым надвор`ем: бываюцьгустыя туманы, слата (слоўнікавая работа), частыя замаразкі, а часам выпадае і снег. Дрэвы стаяць аголеныя, птушкі адляцелі ў вырай. Наступае пара для садаводаў: пасадка дрэў і ягаднікаў, абмазванне ствалоў глінай і вапнай, іх ацяпленне.

Лістапад – вераснёўскі ўнук, кастрычнікаў сын, зіме бацюхна родны. Сучаснае беларускае найменне – лістапад тлумачыцца проста: канец ападання лісця з дрэў.
У пачатку лістапада адлятаюць апошнія чароды качак, дрэвы стаяць ужо амаль без лісця, з`яўляюцца туманы. Вёска на нейкі час вызваляецца ад сельскагаспадарчых работ. Дары асенняга поля і лесу ўжо добра ўладкаваны ў скляпах і кладоўках.

4. Фізкультхвілінка

*Пацягнуцца рукой і ўсім целам угару (дрэва),* Вецер дрэва пагайдаў,

*нахіліцца ўправа, улева. Прысесці (сабраць лісце), хутка ўстаць, рукі ўгару (падкінуць лісце), нахіліцца целам наперад (прамыя рукі адвесці назад), падзьмуць. Паскакаць. Раскінуўшы рукі ўбакі, пакружыцца. Прысесці, глыбокі ўдых-выдых (стаміўся).*

Лісце ў неба падкідаў,
Дзьмуў на хмары дыаблокі,
Па траве пусціўся ў скокі!
Ён віхурай закруціўся,
Ды спыніўся, бо стаміўся!

5. Работа па развіцці мовы
   1) Камп'ютарная гульня "Блытаніна"
   2) Складанне развітых сказаў з дапамогай апорных слоў.
      На дошцы запісаны сказы
      *Надыйшла восень.*
      *Сонца свеціць.*
      *Вецер дзьме.*
      *Птушкі адлятаюць.*
      *Дажджы ідуць.*
      *Грыбы растуць.*
      *Яблыкі паспелі.*
      *Лісце жаўжее.*
      (да дзейніка і выказніка будзем дабаўляць дадашыя члены сказа і атрымаем новыя развітыя сказы)
      З атрыманых сказаў складаем звязны тэкст.
   3) Самастойнае складанне тэкста па малюнку.
      (прапаноўваюцца малюнкі ранняй восені)

IV. Вынік занятку
Што рабілі на сённяшнім занятку?
Аб чым гаварылі на сённяшнім занятку?
Што новага даведаўся на занятку?
Чаму навучыўся?

V. Рэфлексія "Астравы"
Ацаніць свой настрой і азначыць яго на адпаведным востраве.
*(Востраў смутку, радасці, задавальнення, поспеху, абыякавасці).*

VI. Арганізацыйны момант

VII. Актуалізацыя ведаў і пастаноўка праблемы.

VIII. Асноўная частка

6. Пастаноўка задач карэкцыйнага занятку

7. Самастойная работа. Картка № 1.
   Гульня “Даскажы слоўца”. Падбор да назоўнікаў дзеясловаў, якія падыходзяць па сэнсе.
8. **Рубрыка “Цікава ведаць”**
9. Фізкультхвілінка
10. Работа па развіцці мовы
    4) Камп’ютарная гульня “Блытаніна”
    5) Складанне развітых сказаў з дапамогай апорных слоў.
    6) Самастойнае складанне тэкста па малюнку.

IX. Вынік занятку

X. Рэфлексія “Астравы”